# Беларусь у сярэдзіне XIII-XIV стагоддзя

**Назавіце шляхі ўваходжання беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага.**

Працэс стварэння адной з самых буйных дзяржаў Еўропы ў эпоху сярэдневякоўя — Вялікага Княства Літоўскага быў доўгім і складаным: пачаўся ён у першай палове XIII ст. і закончыўся недзе ў 60-я гг. XIV ст. Ядром дзяржавы сталі землі Навагародскага княства разам з суседнімі літоўскімі. Шляхі ўваходжання іншых беларускіх зямель у склад гэтага поліэтнічнага дзяржаўнага ўтварэння, як мяркуюць, былі розныя. **Гэта дыпламатычныя пагадненні, шлюбныя сувязі, захопы.** Але скупыя, разрозненыя звесткі, што дайшлі ад той пары, не дазваляюць вызначыць дакладную карціну гэтага працэсу. З упэўненасцю можна гаварыць толькі аб **дабравольна-дагаворнай аснове** ўваходжання ў склад Літоўскай дзяржавы найбольш буйных беларускіх зямель — Полацкай і Віцебскай. Аб гэтым сведчаць прывілеі вялікіх князёў літоўскіх, якія зацвярджалі аўтаномны статус гэтых зямель у складзе Вялікага Княства. Наяўнасць названых дакументаў дазваляе гаварыць аб федэратыўнасці створанай дзяржавы. Феадальныя княствы-дзяржавы, што існавалі на тэрыторыі Беларусі, наяўнай у іх са старажытных часоў развітой гаспадаркай, прававой сістэмай і сістэмай улады, культурай, удыхвалі свае багатыя традыцыі і новай дзяржаве, робячы яе Вялікім Княствам. У той жа час, страчваючы ў выніку аб'яднання ў пэўнай частцы свой суверэнітэт, беларускія землі тым не менш атрымалі права і на далейшае самаразвіццё і самасцвярджэнне.

**Поўная назва Старажытнай беларускай дзяржавы, якая прыйшла на змену Полацкаму княству,— «Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае». Што Вы ведаеце аб землях, якія ўвайшлі ў яе склад?**

Як сведчаць старажытныя летапісы, пасля заняпаду Полацкага княства на Беларусі ўзнікла новае дзяржаўнае ўтварэнне, якое прадоўжыла незалежніцкую традыцыю беларускіх зямель, распачатую славутымі полацкімі князямі. Новы дзяржаўны цэнтр — **«Літва»**, або «Літоўскае княства», знаходзіўся на захадзе Беларусі ў верхнім Панямонні са сталіцай у г. Навагародку. Пасля добраахвотнага аб'яднання Літоўскага Княства з Полацкім і Віцебскім і далучэння іншых зямель, што былі размешчаны на ўсход ад Менску і мелі гістарычную назву **«руськия»**, новая дзяржава атрымала назву «Вялікае Княства Літоўскае і Рускае».

У XIII ст., у часы вялікага князя Міндоўга, да княства была далучана **Аўкштота (Аўкштайція)** — усходняя і заходняя часткі цяперашняй Літвы, а пасля Грунвальдскай бітвы 1410 г. і **Жмудзь (Жамайція)** — заходняя частка сучаснай Літвы. Пасля гэтага да назвы дзяржавы было дададзена слова «Жамойцкае».

Балцкія плямёны аўкштота і жмудзь з'яўляюцца продкамі сучаснага насельніцтва Літоўскай рэспублікі, цяперашніх літоўцаў, ці, як яны сябе называюць,— «летувісаў», а сваю дзяржаву **«Летувой».**

У старажытнасці ж «літоўцамі» і «літвінамі» называлі насельніцтва цэнтральнай і заходняй частак Беларусі, «русінамі», «русічамі» (у адрозненне ад «маскалёў», жыхароў суседняй дзяржавы) звалі насельніцтва ўсходу Беларусі.

**Што сведчыць аб тым, што ў складзе Вялікага Княства Літоўскага Полацкая і Віцебская землі мелі статус феадальнай аўтаноміі?**

Той акалічнасцю, што Полацкая і Віцебская землі ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага на дагаворных умовах, тлумачыцца аўтаномны статус гэтых тэрыторый у дзяржаве. Галоўныя рысы аўтаномнасці вынікаюць з земскіх прывілеяў Полацкай і Віцебскай зямель, якія выдаваліся і пацверджваліся ўсімі вялікімі князямі. Яны, гэтыя рысы, былі звязаны, па-першае, **з правам палачан і віцяблян уплываць на рашэнні вялікага князя літоўскага пры назначэнні ім намеснікаў і ваявод** у Полацкай і Віцебскай землях. Вялікі князь быў абавязаны «им давати воеводу по старому, по их воли, и который им будет нелюб воевода ... ино нам воеводу им иного дати, по их воли». У іншых землях Вялікага Княства мясцовая знаць такога права не мела. Аўтаномнасць гэтых зямель, па-другое, **прадугледжвала абмежаванне судовай улады намеснікаў і ваявод** на Полаччыне і Віцебшчыне. Так, у прыгаданых земскіх прывілеях спецыяльна агаворвалася: «А воеводе нашому полоцкому мешчан одному не судити, судити ему с бояры и мешчаны». Фактарам аўтаномнасці, па-трэцяе, заставалася **функцыяніраванне полацкага і віцебскага веча (сойма),** на якіх вырашаліся многія пытанні мясцовага самакіравання: выбрання мясцовых улад, нясення воінскай службы, гаспадарчыя гарадскія справы. **Манапольнае права полацкага і віцебскага баярства на ўсе пасады мясцовага кіравання** таксама было фактарам аўтаномнага статуса гэтых зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага.

**Якая дзяржаўна-прававая арганізацыя была характэрнай для Вялікага Княства Літоўскага?**

Вялікае Княства Літоўскае — адна з дзяржаў **унітарнага тыпу,** якія спараджаліся сярэдневякоўем. Калі ў дафеадальны перыяд палітыка захопаў была адзінай у вырашэнні міждзяржаўных, міжэтнічных супярэчнасцей, то феадалізм спарадзіў і дагаворныя формы вырашэння палітычных праблем. Так, 1397 г. стаў годам заключэння Кальмарскай уніі, што аб'яднала ў адзіным дзяржаўным арганізме для вырашэння ўнутраных праблем і прадухілення знешняй пагрозы тры скандынаўскія краіны — Данію, Швецыю, Нарвегію. Таксама і кіруючыя вярхі (баярства) беларускіх зямель, у прыватнасці найбольш буйных — Полацкай і Віцебскай, самастойнасці якіх пагражала агрэсія крыжакоў, пайшлі

на пагадненне, саюз з літоўскімі князямі. Аб існаванні дагавора («рада») паміж названымі бакамі сведчаць прывілеі Полацкай і Віцебскай землям, якія пацверджваліся ўсімі вялікімі князямі літоўскімі.

## Якой дзяржавай па форме кіравання было Вялікае Княства Літоўскае?

Вялікае Княства Літоўскае было **феадальнай манархіяй** на чале з вялікім князем — носьбітам заканадаўчай, выканаўчай, судовай, ваеннай улады, якую ён ажыццяўляў у інтарэсах пануючага класа з дапамогай феадальнай знаці.

## Хто з'яўляўся вярхоўным уласнікам зямлі ў Вялікім Княстве Літоўскім?

Вялікае Княства Літоўскае — феадальная дзяржава, у склад якой у XIII — XVIII стст. уваходзілі беларускія землі. На чале дзяржавы стаяў **вялікі князь (гаспадар).** Вялікі князь з'яўляўся вярхоўным уласнікам усіх зямель у дзяржаве і фактычным уласнікам значнага фонду так званых гаспадарскіх зямель. Папаўняўся гэты фонд у выніку ваенных захопаў, канфіскацый, за кошт завешчаных або застаўшыхся без спадкаемцаў маёнткаў.

Паколькі эканамічнай асновай феадальнага спосабу вытворчасці была феадальная ўласнасць на зямлю, вялікаму князю належала і эканамічнае вяршэнства ў дзяржаве, яму падпарадкоўваліся іншыя князі і буйныя феадалы-паны не толькі ў палітычных, але і ў эканамічных адносінах. Землеўладанне свецкіх і царкоўных феадалаў пашыралася ў асноўным за кошт менавіта велікакняскіх падараванняў.

## Які горад лічыцца першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага?

Першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага быў горад **Навагарадок** (сённяшні Навагрудак Гродзенскай вобласці), у якім, паводле Густынскага летапісу, першы вялікі князь літоўскі Міндоўг у 1252 г. прыняў хрысціянства, а ў 1253 г.— каранаваўся. На карысць гэтага можна аднесці і сведчанне «Хронікі Літоўскай і Жмойцкай», якая называе Навагарадок «замок столечный». У пачатку XIV ст. (1323 г.) вялікі князь Гедымін перанёс сталіцу Вялікага Княства Літоўскага з Навагародка ў Вільню.

## Якая мова была дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім?

Дзяржаўнай мовай у Вялікім Княстве Літоўскім была мова нашых продкаў — **старабеларуская.** На ёй гаварыў велікакняскі двор, гэта была мова судоў, дзяржаўных актаў, у адным з якіх — Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1588 г., замацоўваўся яе дзяржаўны статус: «А писар земский маеть по руску литерами и словы рускими вси листы, выписы и позвы писати, а не иншим езыком и словы...»

**Назавіце вышэйшыя органы ўлады Вялікага Княства Літоўскага.**

На чале Вялікага Княства Літоўскага стаяў **вялікі князь (гаспадар)**. Але ўлада яго ў XV—XVI стст. не была неабмежаванай. Яе абмяжоўваў у першую чаргу такі вышэйшы орган дзяржаўнага кіравання, як **Рада** («паны-рада»). Велікакняская Рада ў першыя часы свайго існавання выступала ў якасці савета пры гаспадару, не маючы пэўнага складу і канкрэтна акрэсленых функцый. Аднак па меры ўзмацнення феадальнай знаці ў княстве (асабліва пры вялікім князю Казіміры) Рада адасабляецца ў самастойны, асобны ад вялікага князя, орган улады. У 1492 г. вялікі князь Аляксандр выдаў прывілей, паводле якога гаспадар быў абавязаны весці дыпламатычныя зносіны з іншымі краінамі толькі па ўзгадненню з панамі-раднымі; у справах унутраных нічога сваёй воляй не адмяняць, што было вырашана разам з Радаю; без згоды яе членаў не рабіць прызначэнні на дзяржаўныя пасады ці змяшчаць з іх; нарэшце, распараджацца фінансамі вялікі князь мог толькі пад кантролем Рады. У канцы XV ст. канчаткова аформіўся другі вышэйшы орган дзяржаўнай улады Вялікага Княства Літоўскага — **Сойм** («вальны» (агульны) сейм). Яго з'яўленне было абумоўлена неабходнасцю пашырэння сацыяльнай апоры вярхоўнай улады. У склад Сойма ўваходзілі паны-радныя, шматлікія службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага дзяржаўнага апарату, на яго пасяджэннях магла прысутнічаць уся шляхта Вялікага Княства. Першапачаткова ў соймавую кампетэнцыю ўваходзіла вырашэнне пытанняў, якія былі звязаны з заключэннем уніі з Польшчай і выбраннем вялікіх князёў. З цягам часу кола пытанняў, што абмяркоўваліся і вырашаліся на Соймах, пашыралася. На працягу XVI ст. на парадак дня соймавых пасяджэнняў выносіліся пытанні аб аб'яўленні вайны і нормах вайсковай службы, аб прызначэнні падаткаў, аб заканадаўстве, аб судовай дзейнасці.

**На якія асноўныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі падзялялася Вялікае Княства Літоўскае ў XV — XVIII стст.?**

Асноўнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, на якія падзялялася тэрыторыя Вялікага Княства, пачынаючы з XV ст., былі **ваяводствы** і **паветы**. Першапачаткова, у 1413 г., былі ўтвораны 2 ваяводствы — Віленскае і Трокскае. У 1503 г. узнікла Віцебскае, Полацкае, у 1507 г.— Навагародскае (Наваградскае) ваяводствы. Рэформы 1565—1566 гг. у Вялікім Княстве Літоўскім прывялі яго адміністрацыйна-тэрытарыяльную структуру да пэўнага адзінства. На беларускіх землях былі створаны Берасцейскае ваяводства з паветамі Берасцейскім і Пінскім; Віцебскае, куды ўвайшлі паветы Віцебскі і Аршанскі; Менскае ваяводства з паветамі Менскім, Рэчыцкім, Мазырскім; Мсціслаўскае ваяводства ў складзе Мсціслаўскага



Гедымін.

павета; Полацкае — у складзе Полацкага павета; Наваградскае ваяводства з паветамі Наваградскім, Ваўкавыскім, Слонімскім. У Віленскае ваяводства былі ўключаны паветы Ашмянскі і Браслаўскі. У Трокскае ваяводства — паветы Гарадзенскі і Лідскі. У Кіеўскае ваяводства быў уключаны Брагінскі павет. Такі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел без асаблівых змяненняў праіснаваў да канца XVIII ст. — часу далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі.

**Чаму герб Вялікага Княства Літоўскага атрымаў назву «Пагоня»?**

Герб «Пагоня» ў летапісных крыніцах упершыню ўпамінаецца ў канцы XIII ст. у Іпацьеўскім летапісе: «Витен нача княжати... измысли себе герб и всему княжеству печать: рыцер збройный на коне з мечем, еже ныне наричут погоня». За дзяржаўны герб Вялікага Княства Літоўскага «Пагоня» — выява сярэбранага колеру вершніка на чырвонага колеру шчыце — была прынята ў 1384 г.

**Малюнак конніка з мячом азначаў воіна, які гатовы абараняць сваю радзіму ад ворага.** Трэба заўважыць, што тэрмінам «пагоня» ці «пагоняй» ад беларускага слова «гнаць, праганяць» звалася і сама ваенная павіннасць па абароне дзяржавы, «апалчэнне». Беларусы складалі большасць насельніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім, таму не дзіўна, што менавіта гэтым беларускім словам і назвалі ваенную павіннасць па абароне дзяржавы. Пацверджвае гэта і тэкст граматы вялікага князя Літоўскага і караля польскага Ягайлы ад 20 лютага 1387 г., дзе гаворыцца, што для праследавання ворага, «якое па-народнаму завецца пагоняй, абавязаны адпраўляцца не толькі рыцары, але і кожны мужчына, якога б ён ні быў паходжання ці стану, толькі б быў здольны насіць зброю». Верагодна, што і сам герб выкарыстоўваўся спачатку толькі як ваенны.


«Пагоня». Герб Вялікага Княства Літоўскага.

Збройны коннік стаў сімвалам усяго народа ў яго барацьбе з крыжакамі. Існуе меркаванне, што выява вершніка з мячом, звернутая ў левы бок, ёсць сімвал супрацiўлення надыходзячай з Захаду пагрозы. У Грунвальдскай бітве 1410 г., калі былі ўшчэнт разбіты крыжакі, «Пагоня» была на 30 з усіх 40 баявых харугваў войска Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта гэтыя 30 харугваў былі вылучаны з беларускіх зямель. Польскі гісторык XV ст. Ян Длу-

гаш адзначаў, што «прапары гэтых харугваў былі ўсе амаль аднолькавыя, таму што амаль кожная з іх мела на ім воіна з мечам у панцыру на белым, рэдка чорным, ці гнедым, або пегім кані ў чырвоным полі».

Адлюстраванне «Пагоні» як адной з асноўных эмблем беларускай геральдыкі ў XVI—XIX стст. было на ваенных сцягах і гербах многіх беларускіх гарадоў. Яшчэ больш распаўсюджаным стаў герб «Пагоня» на Беларусі пасля яе далучэння да Расіі, калі ён перастаў быць толькі ваенным гербам. Новыя губернскія, павятовыя і гарадскія гербы зацверджваліся з улікам гістарычных асабліваcцей розных мясцін і захаваннем геральдычных традыцый Вялікага Княства Літоўскага. Для геральдыкі княства былі характэрнымі два колеры — чырвоны і белы (сярэбраны). Чырвоны колер азначаў смеласць, адвагу, пралітую за Айчыну кроў; белы — сумленнасць, чысціню, нявіннасць.

У XIX ст. выява «Пагоні» стала асновай гербаў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай губерняў, Ашмянскага, Вілейскага, Дзісненскага, Лідскага, Рэчыцкага паветаў, гарадоў Віцебска, Гарадка, Дрысы, Лепеля, Магілёва, Слуцка, Полацка і інш.

Гісторыя старадаўняга герба «Пагоня» — наша спадчына, памяць аб гераічным мінулым Бацькаўшчыны.

### Які выдатны беларускі паэт прысвяціў старажытнаму гербу Беларусі верш?

**Максім Багдановіч** свой верш, прысвечаны старажытнаму гербу Беларусі, назваў па імені герба — «Пагоня».

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Ўспомню Вострую Браму Святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць:
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль...

Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

**Якія знакамітыя роды Вялікага Княства Літоўскага паходзілі з беларускіх зямель?**

З беларускіх зямель паходзілі буйныя **княскія роды** Сапегаў, Друцкіх, Адынцэвічаў, Горскіх, Сакалінскіх, Прыхабскіх, Азярэцкіх, Красных, Талачынскіх, **баярскія роды** Глябовічаў, Ілінічаў, Неміравічаў, Копцавічаў, Зяноўевічаў, Багавіцінавічаў і шэраг іншых.

**Назавіце імя славутага гарадзенскага ваяводы, які не пацярпеў ніводнага паражэння ад крыжакоў.**

Імя гэтага гарадзенскага ваяводы, сына князя Доўманта і княгіні Марыі, унучкі Аляксандра Неўскага — Давыд, які ўвайшоў у гісторыю **Давыдам Гарадзенскім.** У 1314 г. Давыд са сваёй дружынай разбіў крыжакоў, што напалі на Наваградак. У 1318 г. ён узначаліў пераможны паход гарадзенцаў на Прусію. У 1323 г., калі войска Лівонскага ордэна абложыла Пскоў, «послаше псковичи к Давыду князю в Литву» за дапамогай. І той выратаваў горад ад крыжацкай навалы, адкінуўшы рыцараў аж да Балтыкі. Наступны ўдар Ордэну Давыд нанёс у Мазовіі ў 1324 г. А праз два гады ён арганізаваў паход на Брандэнбург, у час якога быў паздрадніцку (ударам нажа ў спіну) забіты наёмным польскім рыцарам. Воіны-гарадзенцы прынеслі цела свайго ваяводы дамоў на шчытах і пахавалі на беразе Нёмана каля старажытнай Каложы.

**Калі адбылася бітва на рацэ Сінія Воды, у якой войска вялікага князя Альгерда разбіла татарскія полчышчы?**

У **1362 г.** на рацэ Сінія Воды — левым прытоку Паўднёвага Буга войска на чале з Альгердам атрымала перамогу над татарамі. У выніку Падолле і Кіеўшчына былі вызвалены ад мангола-татарскага іга і далучаны да Вялікага Княства Літоўскага.

**Аб якіх гістарычных асобах апавядаюць наступныя радкі славутага помніка старажытнарускай літаратуры «Задоншчына»: «О, соловей, летня птица, чтобы ты, соловей, выщекотал земли Литовской дву братов Альгердовичей — Ондрей да брат его Дмитрей Альгердовичей, да Дмитрей Волынский. Те бо суть сынове храбрии, крчати в ратном времени, ведоми полководцы, под трубами и под шеломы возлелеяны, конец копья вскормлены...»? Чым яны слаўныя?**

Гэтымі ўзнёслымі словамі аўтар «Задоншчыны» ўхваляе герояў Кулікоўскай бітвы **князя Андрэя Полацкага,** яго малодшага брата **Дзмітрыя** і іх стрыечнага брата **Дзмітрыя Баброка-Валынскага.** Андрэй Полацкі, паводле «Хронікі Літоўскай і Жмойцкай», прывёў на Кулікова поле «войско великое» (мяркуюць, што ў ім было каля 2 тыс. полацкіх і пскоўскіх вояў) і камандаваў у бітве з Мамаем палком правай рукі. Полк адбіў усе напады ворага і прымусіў яго адступіць. Засадны ж полк, якім камандаваў Дзмітрый Баброк-Валынскі, практычна вырашыў зыход бітвы на карысць рускіх войск.



Кароль Уладзіслаў Ягайла. Партрэт з надмагільнай пліты.

**Якая падзея адбылася ў 1385 г. у замку Крэва?**

14 жніўня 1385 г. у Крэве (сёння мястэчка ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці) была заключана першая **унія (саюз) паміж Польшчай і Вялікім Княствам Літоўскім.** Унія была асабістай (персанальнай). Паводле яе, на чале абедзвюх дзяржаў станавіўся адзіны правіцель, а менавіта кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ягайла.

**На якой мове гаварыў кракаўскі двор пасля таго, як вялікі князь літоўскі Ягайла стаў і каралём польскім?**

Вялікі князь літоўскі Ягайла — сын вялікага князя Альгерда і цвярской княгіні Ульяны, прывёз на Вавель — рэзідэнцыю польскіх каралёў сваю родную **старабеларускую мову.** А разам з гэтым прывёз і мову старабеларускага мастацтва, таму што, як вядома з каралеўскіх прыходна-расходных кніг, і лютністамі, і цымбалістамі, і мастакамі пры каралеўскім двары былі ў той час выхадцы з беларускіх зямель.

**Што Вам вядома аб бітве паміж войскамі Вялікага Княства Літоўскага на чале з князем Вітаўтам і ардынскім войскам Цімур-Кутлуя і Едыгея?**

У 90-х гг. XIV ст. вялікі князь літоўскі Вітаўт выступіў з праграмай стварэння самастойнага Руска-Літоўскага каралеўства, якое б уабрала ўсе ўсходнеславянскія землі. Для ажыццяўлення гэтай праграмы ён узяў у саюзнікі былога залатаардынскага хана Тахтамыша, які выдаў Вітаўту ярлык на кіраванне ўсімі рускімі


Вітаўт.

землямі. Аб умовах іх саюзу даведваемся з летапісаў: «Витовт рече: «Я тебя (Тахтамыша) посажю на Орде... а ты мене посади на Московском великом княжении...» Аднак гэтым далёкасягаючым планам здзейсніцца не ўдалося. **12 жніўня 1399 г. на рацэ Ворскле** (Палтаўшчына) адбылася рашаючая бітва паміж кааліцыяй Вітаўт — Тахтамыш і залатаардынскім войскам, што ўзначальвалі Цімур-Кутлуй і Едыгей, у якой «попусти бог татаром». Войска Вітаўта было амаль цалкам знішчана, сам жа вялікі князь «побеже в мале дружине».

**Пасля якой пераможнай бітвы XV ст. землі ўсходніх славян пяць стагоддзяў не ведалі нямецкай агрэсіі?**

Гэта бітва, што адбылася **15 ліпеня 1410 г. пад Грунвальдам** паміж аб'яднанымі войскамі Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, з аднаго боку, і войскамі Тэўтонскага ордэна, з другога.

**Колькі харугваў з беларускіх зямель удзельнічала ў Грунвальдскай бітве?**

Аб'яднанае войска Вітаўта і Ягайлы налічвала пад Грунвальдам, па звестках польскага гісторыка XV ст. Яна Длугаша, 90 харугваў, сярод якіх **40 ад Вялікага Княства Літоўскага.** На жаль, Ян Длугаш з гэтых 40 харугваў дакладна назваў толькі 21, у тым ліку з беларускіх зямель Гродзенскую, Лідскую, Полацкую, Віцебскую, Наваградскую, Ваўкавыскую, Берасцейскую, Пінскую. Але вядома, што ў гэтай гістарычнай бітве ўдзельнічалі таксама Мсціслаўскі, Аршанскі, Слуцкі, Магілёўскі палкі, воіны з Нясвіжа, Кобрына, Крэва, Лукомля, Ашмянаў.

**Якія пастановы (прывілеі) вялікіх князёў літоўскіх паставілі праваслаўных феадалаў у Вялікім Княстве Літоўскім у няроўнае становішча ў параўнанні з каталіцкімі?**

Першымі сярод такіх прывілеяў трэба назваць **граматы караля польскага і вялікага князя літоўскага Уладзіслава-Ягайлы ад 20 і 22 лютага 1387 г.** Паводле іх, феадальная знаць каталіцкага веравызнання, якая была ў большасці літоўскага паходжання, атрымлівала ў поўную асабістую ўласнасць тыя зямельныя ўладанні, якія раней дававаліся ў часовае трыманне. А сяляне гэтых маёнткаў вызваляліся ад выканання шэрага дзяржаўных павіннасцей. На праваслаўных феадалаў, што вялі сваю радаслоўную з беларускіх і ўкраінскіх зямель, названыя прывілеі не распаў-

сюджваліся. Гэтыя ж палажэнні замацоўваліся **актам 1401 г.** Далей ішла **пастанова Гарадзельскага сойму 1413 г.** аб уніі паміж Вялікім Княствам і Польшчай, паводле якой праваслаўная знаць княства ставілася практычна ў дыскрымінацыйнае становішча. § 3 Гарадзельскай пастановы, працягваючы прывілеі 1387 і 1401 гг., устанаўліваў, што толькі «каталікі, Рымскай царкве падуладныя», валодаюць і карыстаюцца эканамічнымі і палітычнымі прывілеямі і падараваннямі пануючаму класу з боку вярхоўнай улады. У § 6 пацвярджалася забарона на шлюбы паміж католікамі і праваслаўнымі. Асаблівае значэнне ў далейшай унутрыпалітычнай барацьбе ў Вялікім Княстве Літоўскім меў § 9 Гарадзельскага прывілею, па якому на «дастоінства, месцы і пасады» назначаліся «толькі каталіцкай веры прыхільнікі і падуладныя святой Рымскай царкве». Гэта значыць — праваслаўная знаць практычна адлучалася ад улады, ад кіравання дзяржавай. § 11 і 12 пазбаўлялі праваслаўных феадалаў права выбрання вялікага князя, якім зноў жа карысталіся толькі «паны і шляхціцы зямлі літоўскае, прыхільнікі хрысціянскае рэлігіі, Рымскай царкве падуладныя, не схізматыкі ці іншыя паганыя».

**На якія два дзяржаўныя ўтварэнні распалася Вялікае Княства Літоўскае падчас грамадзянскай вайны 30-х гг. XV ст.?**

Пасля смерці вялікага князя літоўскага Вітаўта на вялікакняскі прастол быў выбраны князь Свідрыгайла, пры якім пачала ўзрастаць палітычная роля праваслаўных феадалаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Выпадзенне ўлады з рук каталіцкай арыстакратыі прывяло да змовы яе супраць Свідрыгайлы Альгердавіча. У ноч на 1 верасня 1432 г. адбыўся замах на вялікага князя. Змоўшчыкі пасадзілі на віленскі прастол брата Вітаўта Жыгімонта Кейстутавіча, а Свідрыгайла ратаваўся ўцёкамі ў Полацк. Пасля гэтага Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае распалася на два дзяржаўныя ўтварэнні: **Вялікае Княства Літоўскае** і **Вялікае Княства Рускае.** Як адзначае летапісец: «И Литва же посадиша великого князя Жигимонта Кесьтутевичъ на великое княжение на Вилни и на Троцех месяца сентября 1 день. И приде Швитригаило на Полотескъ и на Смоленскъ, и князи руськыи и бояре посадиша князя Швитригаила на великое княжение на Руское». Княства гэтае на аснове дзяржаўнай аўтаноміі Полацкай, Віцебскай, Смаленскай зямель у складзе Вялікага Княства існавала чатыры гады. Яно загінула ў выніку ваеннага паражэння войск Свідрыгайлы ад войска Жыгімонта ў бітве пад Вількамірам (сучасны Укмерге, Літоўская Рэспубліка) летам 1435 г.

**Назавіце імя вялікага князя літоўскага, які ў XV ст. княжыў 52 гады.**

З 1440 па 1492 г. вялікім князем літоўскім, а з 1447 г. і каралём польскім быў **Казімір Ягелончык** — сын вялікага князя Уладзіслава-Ягайлы і яго чацвёртай жонкі Соф'і Гальшанскай.